# “КУФАР ЖЫЦЦЯ” Ў НАРЫСЕ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА “ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ”

*УО «Гродненский государственный медицинский университет»*

*Лічко К.А., 1 к. 7 гр., ЛФ*

*Кафедра гуманітарных навук*
*Навуковы кіраўнік – к.г.н., дацэнт Сіткевіч С.А.*

Мая праца прысвечана творчасці Уладзіміра Караткевіча. Па словах В. Быкава “роўнага яму няма і наўрад ці ўжо будзе, замяніць яго ў нашай літаратуры не можа ніхто. Ужо хоць бы таму, што ніхто з такім бляскам не спалучаў у нас талент паэта з талентам празаіка, драматурга, кінасцэнарыста, эсэіста, гісторыка...”

Мэта даследавання: больш дэталёва азнаёміцца з нарысам У.Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”, раскрыць сакрэты раздзела “Куфар жыцця”, растлумачыць лексічнае значэнне слова “куфар”, па магчымасці азнаёміцца з асаблівасцямі куфраў з розных рэгіёнаў Беларусі.

Задачы даследавання: вывучыць неабходную літаратуру па тэме; на аснове сістэматызаванага матэрыяла даць агляд рэчаў, што знаходзіліся ў куфрах і высвятліць іх функцыянальнае прызначэнне; раскрыць майстэрства У. Караткевіча ў паказе этнаграфічнага быту беларусаў. У якасці асноўнага метаду работы над тэмай ужываўся параўнальна-гістарычны метад, які ў выніку дазволіў рэалізаваць пастаўленыя мэту і задачы.

Нямала стварыў Уладзімір Караткевіч за чвэрць стагоддзя літаратурнай працы. Лепшыя з яго твораў, безумоўна, надоўга застануцца ў скарбонцы роднай літаратуры. Мастакі з такім выразна адметным талентам, з такім своеасаблівым бачаннем свету нараджаюцца не часта. У. Караткевіча па праву можна назваць вялікім жыццялюбам. Ён плённа працаваў як паэт, празаік, драматург, публіцыст, літаратурны крытык, перакладчык, кінасцэнарыст. Выяўляў асаблівую прыхільнасць да гістарычнай тэматыкі, шмат зрабіў для абуджэння нацыянальнай свядомасці беларусаў. У сваіх нарысах і артыкулах пісьменнік выказваўся па найбольш важных праблемах свайго часу, прычым і сёння гэтыя развагі не страцілі сваёй актуальнасці. Даследчыкі творчасці Уладзіміра Караткевіча зусім справядліва адзначаюць, што шмат якія яго творы “выходзяць за межы чыста літаратурнага мастацтва”.

Непаўторна раскрыўся талент Уладзіміра Караткевіча пры напісанні нарысаў і эсэ. Па-мастацку дасканала, з любоўю да зямлі і людзей расказаў пісьменнік пра Беларусь, яе гісторыю, культуру, мову, літаратуру, фальклор і прыроду ў нарысе “Зямля пад белымі крыламі”.



Репозиторий ГрГМУ

Дакладнасць фактаў, аб'ектыўны падыход да айчыннай гісторыі ў спалучэнні з вобразнай беларускай мовай робяць гэты твор сродкам далучэння сучаснага чытача да спасціжэння і разумення складанасцей гістарычнага лёсу беларусаў. Гэта своеасаблівая мастацкая энцыклапедыя Беларусі, яе візітоўка.

“Пяройдзем цяпер да куфра. Ён зараз амаль выціснуты шафаю, але я кажу аб параўнаўча нядаўнім мінулым, і да таго ж ёсць мясціны, дзе куфар, або скрыня, яшчэ й зараз пануе ў хаце…”(У.Караткевіч).

Куфар – скрыня, драўляная ёмістасць, у якой хавалі тканіны, адзенне, бялізну і каштоўнасці, від мэблі. У куфры збіралі пасаг маладой, а ў час вяселля перавозілі ў дом маладога. Вядомы з часоў позняга сярэднявечча як сховішча каштоўнай цэхавай маёмасці.

Багаццем кампазіцыі, сакавітасцю малюнка, насычанасцю каларыстыкі вызначаюцца куфры з вёскі Агова (Іванаўскі р-н), Крамно (Драгічынскі р-н), Мокрая Дубрава (Пінскі р-н). На ўсходзе Беларусі на вішнёвым фоне малявалі прамую ці касую сетку з чорных палос (імітацыя старажытнай акоўкі), часам аздаблялі прадрапваннем у выглядзе геаметрычнага ці расліннага арнаментаў (Чачэрскі р-н). З пачатку 20 ст. ў многіх рэгіёнах пашыраны куфар з мастацкай размалёўкай расліннага характару. На Заходнім Палессі (Іванаўскі, Драгічанскі р-ны) перавагу аддавалі сакавітым малюнкам у выглядзе букетаў і гірляндаў кветак, якія кампанаваліся ў квадратах і прамавугольніках.

Кожны куфар меў свае сакрэты. Паспрабуем іх вызначыць з дапамогай адпаведнага раздзелу вядомага твора У. Караткевіча:

“А вось стаяць, як палі, сувоі белага ільнянога палатна. Цяпер саматканыя палотны робяць рэдка, але робяць, дый старое палатно берагуць. "Свая" тканіна і вопратка з яе лічацца самай здаровай для летняй спёкі...”

Далей ляжаць "сцежкамі ў полі" розна вышытыя ручнікі. На іх “сінія валошкі з макамі ў вяночак, галубок і пеўнік, ягады каліны, нагаткі, рамонкі, гожыя юргіні. Па канцах карункі тонкім павуціннем...”

“…Ідзе жыццё замужняй жанчыны. У куфры некаторыя рэчы яе, мужа, іншых членаў радзіны. Цяжкі суконны сувой на світку мужу, “дзедаві”. У куфры хавалі з мужчынскага адзення толькі такое, ды яшчэ паясы…”

“Ляжаць белыя “кашулі” (сарочкі), вышытыя па каўняры, рукавах, поліках, а часам і па ўсёй пазусе. Чорна-чырвоныя візэрункі, зялёныя, калі травамі, зялёна-карычневыя, сінія, калі валошкі. Тут жа безрукаўкі. У іх апраналіся паўзверх сарочкі, і называліся яны па-рознаму: “шнуроўка”, “кабат”, “станік”, “гарсэт”. Яны барвовыя, зялёныя, сінія, шнураваныя…”

“Урэшце фартухі. Іх насілі абавязкова. Палатняныя, кужэльныя. Затканыя гарызантальнымі ці (радзей) вертыкальнымі палосамі з кветак, зорак ці крыжыкаў…”

“Тут хусткі. Цёмныя на жалобу, ясныя – на свята, на нядзелю, у гасціну...”

Рэпазіторый ГрГМУ

“Убаку ляжаць некалькі тканых узорных настольніц. Хай едуць госці, хай едуць нават сваты – пасцялі на стол, стаў пірагі, частуй мёдам…”

“Тут жа дываны, тканыя па лёне воўнай…”

“А паясы ляжалі ў куфры. Плеценыя або тканыя. У ёлачку, у капытца (ромбы), у пчолку, двух – і шматкаляровыя, шырокія і вузкія…”

Такім чынам даследаванне аднаго толькі раздзела “Куфар жыцця” з нарыса “Зямля пад белымі крыламі” У. Караткевіча раскрывае, наколькі ўдала, па-майстэрску змог аўтар паказаць веданне беларускага народа, яго арыгінальны этнаграфічны побыт. Думаецца, што наша даследаванне дазваляе паглыбіць ўяўленні аб этнічных асаблівасцях матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, а таксама дае інфармацыю аб некаторых пытаннях этнакультурнай гісторыі.

Беларускі куфар, яго “сакрэты” па сваіх мастацкіх якасцях, разнастайнасці тыпалагічных варыянтаў, высокай ступені этнічнай спецыфікі ўяўляюць сабой каштоўны і яркі здабытак нацыянальнай культуры. Яго вывучэнне мае вялікую практычную значнасць для асэнсавання лепшых традыцый этнаграфічнага побыту беларусаў.

Спіс літаратуры

1. Караткевіч, У. Зямля пад белымі крыламі / У. Караткевіч. – М., 1997.
2. Цітоў, В. Этнаграфічная спадчына / В. Цітоў. – М., 2001.
3. Салівончык, В. Беларускія народныя паясы / В. Салівончык. – Мінск, 1989.
4. Фадзеева, В. Беларускі ручнік / В. Фадзеева. – Мінск, 1994.

## МІХАЛ КЛЕАФАС АГІНСКІ

*УА “Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”*

*Майсевіч Д.І, 2 к., 4 гр., МПФ*

*Кафедра рускай і беларускай моў*
*Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.*

Выдатны і шчыры паланез "Развітанне з Радзімай", урачыста-сентыментальны дзяржаўны польскі гімн "Яшчэ Польска не згінела". У адзінае цэлае іх злучае імя таленавітага аўтара – знакамітага кампазітара і дзяржаўнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага, а таксама месца стварэння гэтых цудоўных твораў – невялікая вёсачка Залессе ў Смаргонскім раёне Гродзенскай вобласці.

Нарадзіўся Агінскі не на беларускай зямлі, а на польскай – у маёнтку Гузава, у сямі мілях ад Варшавы 7 кастрычніка 1765 года. Але ў сваіх "Мемуарах" Міхал Клеафас сцвярджаў, што прыналежыць да "ліцвінскага роду" – "ліцвінскаму" не ў этнічным сэнсе, а ў гістарычным. Яго продкі жылі ва ўсходніх межах Магілёўшчыны, былі праваслаўнага



Репозиторий ГрГМУ